з нашай пошты

# Чакаем новых сустрэч

**У СЯКЕРЫЧАХ** я сустрэў іх з такім румянцам, што модніцы могуць толькі пазайздросціць. Гэта сама вясна і маладосць завіталі да нас у вёску, а дакладней — студэнткі фізічнага факультэта БДУ. Ад пешага ходу з райцэнтра па свежаму паветру зардзеліся юныя твары Тані Дубоўскай, Вольгі Булыга, Жанны Кузьменка.

У САЎГАСЕ «КЛЕЦКІ» з радасцю ўспрынялі мэту «візіцёраў», іх жаданне прысвяціць працоўны семестр нашаму саўгасу. У саўгасе ж — немалы фронт сельскагаспадарчых і рамонтна-будаўнічых работ, ёсць і ўсе магчымасці стварыць спрыяльныя ўмовы, у поўным аб'ёме маюцца будматэрыялы.

Да прадстаўнікоў студэнцкага атрада «Імпульс» (а цяпер атрад перайменаваны ў «Беларусачку») падыходзяць як да добрых знаёмых мясцовыя жыхары. Адамаўна, кладаўшчыца з будбрыгады, з пытаннямі пра вучобу, студэнцкія справы па-мацярынску абдымае Таню Дубоўскую. Брыгадзір садаводаў Мікалай Кузьміч Ясьман, пазнаўшы іх, вітае студэнтаў, асабліва сваю зямлячку з Гомельшчыны Жанну Кузьменка: «Вось бы такую нявестку ў дом — працалюбівую!» І адразу да справы: «Раз прыехалі, значыць, будзем працаваць ладна, як і летась. Сад добра перанёс суровую зіму, да месца будуць маладыя рукі».

— А на зернетаку будзем працаваць?

— А як жа,— падключаецца загадчык склада М. М. Хоміч.— Так і арыентуйце да мяне Іну Драздоўскую, Вікторыю Рэуцкую, Люду Бакшыцееву, Жанну Кузьменка...

...Дагавор з дырэктарам саўгаса «Клецкі» Анатолем Мікалаевічам Рубанікам і будатрадам «Беларусачка» на гэты год заключаны. Клецкая зямля чакае маладых працавітых рук, каб стаць яшчэ больш багатай і квітнеючай. Каб разнастайней і смачней стаў стол працаўніка зямлі, гараджаніна і... студэнта.

Я. ПРЫШЧЭПА,
інжынер-будаўнік саўгаса «Клецкі» Клецкага раёна.

# Гарызонты кафедры

*З 48 краін свету прыязджаюць маладыя людзі на факультэт журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна за ведамі. Задачу сваю калектыў факультэта бачыць не толькі ў тым, каб выхаваць высокакваліфікаваных спецыялістаў, але і дапамагчы асэнсаваць лепшыя рысы сацыялістычнага ладу жыцця, атрымаць ідэйную загартоўку.*

*ПЭЎНУЮ ЧАСТКУ работы ў гэтым напрамку выконвае кафедра замежнай журналістыкі і літаратуры. Выкладчыкі шмат увагі надаюць індывідуальнай рабоце са студэнтамі, часта праводзяць сходы, гутаркі. У аснове гэтых гутарак — матэрыялы XXVII з'езда КПСС, пытанні перабудовы.*

*Аднак мы не абмяжоўваемся работай толькі ў акадэмічных групах і зямляцтвах. Усё часцей праводзяцца маштабныя мерапрыемствы. Стала ўжо добрай традыцыяй праводзіць у інтэрнаце «Дні кафедраў».*

*Надоўга запомняцца студэнтам вечары «Шэкспір і сучаснасць», «А. С. Пушкін і мы». На апошнім было вырашана сабраць у замежнікаў лепшыя вершы ці проста выказванні пра Пушкіна і выдаць рукапісны альманах у некалькіх экземплярах, адзін з іх пакінуць на памяць факультэту, а другі — адвезці ў Міхайлаўскае і перадаць на вечнае захаванне.*

*Нядаўна наш калектыў рыхтаваўся да правядзення чарговай сустрэчы, прысвечанай Дню друку. Са студэнтамі праводзіліся гутаркі пра друк Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, студэнты сустрэліся з цікавымі людзьмі.*

*Т. ЛУЙГАС,*
*старшы лабарант кафедры*
*замежнай журналістыкі і літаратуры.*

палітычны кірмаш

# Салідарнасць. Мір. Дружба

ГЭТЫЯ СЛОВЫ ЧАСЦЕЙ ЗА ЎСЕ МОЖНА БЫЛО ПАЧУЦЬ У ДОМЕ НАСТАЎНІКА. ПАЛІТЫЧНЫ КІРМАШ, ЯКІ ПРАЙШОЎ ПА ІНІЦЫЯТЫВЕ ІНТЭРСЕКТАРА КАМІТЭТА КАМСАМОЛА УНІВЕРСІТЭТА, САБРАЎ КАЛЯ ДЗВЮХ ТЫСЯЧ ЧАЛАВЕК БОЛЕЙ ЧЫМ З 80 КРАІН СВЕТУ.





НА ВУЛІЦЫ сустракалі гасцей студэнты з Йемена, частуючы ўсіх сваімі нацыянальнымі стравамі. Побач студэнты з Амана і ГДР гандлявалі плакатамі, паштоўкамі, што расказвалі пра іх краіны. А калі госці і ўдзельнікі кірмашу заходзілі ў Дом настаўніка, то адразу траплялі ў незвычайны кругаварот музыкі, смеху, кветак. Тут можна было набыць сувеніры з В'етнама, Кіпра, Афганістана, убачыць нацыянальныя касцюмы розных краін свету.

А які ж кірмаш абыдзецца без гульняў і атракцыёнаў? Іх арганізоўвалі і праводзілі самі студэнты. Працаваў аукцыён, на якім можна было набыць гумарыстычныя плакаты, намаляваныя студэнтамі БДУ.

За салідарнасць моладзі, за мір! Вось у чым заключаўся галоўны сэнс кірмашу. Пра гэта гаварылі маляўнічыя плакаты. Пра гэта былі вершы і песні, што гучалі на канцэрце. Апладысментамі ўзнагароджвалі гледачы студэнтаў-артыстаў з розных краін свету. Яны спявалі песні на рускай і на сваёй нацыянальнай мове, выконвалі беларускія і свае родныя танцы. А потым было выступленне рок-груп «Мроя» і «Модуль», танцавальная праграма.

Свята моладзі завяршылася. Грошы, вычучаныя на кірмашы, пералічаны ў Фонд міру. А ў памяці пабываўшых на ім кірмаш застанецца сімвалам адзінства моладзі ўсіх краін у іх імкненні да міру і дружбы.



*А. СУПРУНОВА,*
*студэнтка факультэта журналістыкі.*

*Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.*

семінар

# Кастрычнік і сучаснасць

По традыцыі ў канцы красавіка ў спартыўным комплексе «Раўбічы» праходзіў семінар кіраўнікоў нацыянальных зямляцтваў студэнтаў замежных краін, якія вучацца ў Беларусі. Прадстаўнікі амаль з 30 краін свету з розных вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў рэспублікі горача абмяркоўвалі пытанні ўплыву ідэй Вялікага Кастрычніка на рэвалюцыйны працэс у сучасным свеце. Наш універсітэт прадстаўлялі 15 студэнтаў і аспірантаў з Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі.

**ДАКЛАДЫ** студэнтаў з БДУ вызначаліся насычанай эмацыянальнасцю, аргументаванасцю, дакладчыкі прадэманстравалі добрыя здольнасці выкарыстоўваць марксісцка-ленінскую метадалогію для аналізу самых складаных праблем сучаснасці. Асаблівай глыбінёй вылучаўся даклад Башара Браіма Адума (Чад), прысвечаны эканамічным пытанням. Уразіў расказ аспіранта з Афганістана Насіма Сахара пра цяжкі працэс нацыянальнага прымірэння на яго радзіме, пра верных сяброў і здраднікаў афганскага народа. Наглядна, на аснове фактаў паказаў аспірант з АРЕ Ахмед Талат Хемейда розніцу паміж бескарыснай дапамогай СССР краінам, якія развіваюцца, і крывадушнай дабрачыннасцю заходніх дзяржаў.

Пасля кожнага даклада ўзнікалі ажыўленыя спрэчкі, студэнты абменьваліся думкамі, вучыліся адстойваць свае перакананні, знаходзілі адзіныя заканамернасці рэвалюцыйнай барацьбы ў розных рэгіёнах свету. У гэтых дыскусіях важка гучалі словы Робсана Нкома (Зімбабве), Каса Абелнех Агедэу (Эфіопія).

І як заўсёды, пасля семінараў у Раўбічах мацнее пачуццё, што наш агульны дом — Зямля — вельмі малы, што ўсе мы звязаны адным лёсам і таму павінны вырашаць разам нашы праблемы.

А. КАЛАМІЕЦ,
выкладчык кафедры рускай мовы для замежных студэнтаў.

калектыўны карэспандэнт — «Слова філолага»

Гаворка пойдзе пра загад міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР ад 22 верасня 1986 г. «Аб развіцці ініцыятывы навукова-педагагічных калектываў ВНУ, пашырэнні іх правоў у ажыццяўленні перабудовы вучэбнага працэсу». У перабудове вышэйшай школы, што зараз адбываецца,— гэта адзін з першых абнаўляльных рэгулятараў жыцця ВНУ. Загад быў выдадзены яшчэ да таго часу, калі праект ЦК КПСС аб перабудове вышэйшай школы вырас у «Асноўныя напрамкі перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне». Але нельга лічыць яго значэнне часовым: ён уключае ў сябе тое бясспрэчнае, што абавязкова будзе ў перабудове ВНУ і што не церпіць адкладу. Давайце прачытаем яго разам.

# ВОЛЬНАЕ НАВЕДВАННЕ,

## або Якім шляхам да яго ісці?

**СКАРАЧЭННЕ** абавязковых аўдыторных заняткаў на I—III курсах да 28 гадзін у тыдзень, на IV—V — да 24 гадзін за кошт замены гэтых заняткаў самастойнай работай студэнтаў пад кантролем выкладчыка — гэта адно з галоўных палажэнняў загаду. У чым яго каштоўнасць? У прызнанні недастатковай эфектыўнасці аўдыторных заняткаў у параўнанні з самастойнай работай студэнтаў. У прызнанні таго, што студэнт можа хоць частку праграмы вывучыць самастойна.

Самае важнае тут, на мой погляд,— у вызваленні часу для самастойнай работы студэнта. Зразумела, што гэта толькі першы і яшчэ нясмелы крок — добра было б, каб не 28 гадзін аўдыторных заняткаў у тыдзень, а 16—20. І тады асноўным у працы студэнтаў будуць не лекцыі і семінары, а самастойнае вывучэнне матэрыялу. Лекцыі ж будуць патрэбны для ўвядзення у курс справы, для стымулявання цікавасці да прадмета; семінары — для кансультацый, дыскусій, абмеркавання самых складаных пытанняў, кантролю; самастойная работа — для таго, каб студэнт, напрыклад, філолаг, сустрэўся сам-насам з кнігамі, тэкстамі, граматыкамі, слоўнікамі. Ды і формы самастойнай работы набудуць новы змест. Падрыхтоўка да экзаменаў (у якой заўсёды многа нятворчага, механічнага і таму недастаткова трывалага завучвання) адыдзе на другі план. Асноўнай будзе вучэбная вынаходніцкая работа — курсавыя, семестравыя, семінарскія работы па розных прадметах. Тады і пытання аб так званым вольным наведванні не будзе існаваць. Зразумела, яно будзе вольным праз некаторы час.

Чаму ж зараз мы не падрыхтаваны да такіх паваротаў?

Па першае, па-сапраўднаму авалодваць прафесійнымі ведамі — гэта праца, і не ў кожнага хопіць сабранасці і настойлівасці, каб засвоіць праграму, калі ніхто не падштурхоўвае.

І ўсё ж «прымусовае» навучанне ў ВНУ становіцца ўсё менеи апраўданым — яно абарочваецца нізкай якасцю спецыялістаў. А якая карысць ад невукаў? Іменна таму і ў Асноўных напрамках, і ў загадзе прадугледжаны меры, якія прывядуць да адсеву тых, хто не можа або не жадае вучыцца. У Асноўных напрамках — калі гаворыцца аб «адборы» будучых спецыялістаў на працягу ўсяго тэрміну навучання, у загадзе — калі гаворыцца: «Узняць узровень патрабаванняў да ведаў студэнтаў, што ацэньваюцца на «здавальняюча». Адмяніць існуючую сістэму ўмоўных пераводаў на наступны курс».

Адсеў — гэта справа непрыемная. І для студэнтаў, і для выкладчыкаў, і для дзяржавы. Але іншага шляху для паляпшэння якасці падрыхтоўкі ў ВНУ, для выхавання самастойнасці і адказнасці студэнта проста няма.

Зараз на факультэце мы робім толькі першыя спробы на шляху перабудовы: у раскладзе «бялеюць» дні, а часам і тыдні, вызваленыя для самастойнай падрыхтоўкі студэнтаў. На кафедрах і ў аўдыторыях спрачаюцца, як лепей накіраваць гэтую працу. Здаецца, на некаторых курсах тыдзень для самападрыхтоўкі ператвараецца ў міні-сесію са штодзённай спланаванай працай і штодзённай справаздачнасцю (кантрольныя работы, калёквіумы). Мабыць, можна будзе пераканацца, што студэнтам многае па сілах і без лекцый (у чым я і так не сумняваюся). Але ж сапраўднай адказнасці ў сваіх занятках, у планаванні працоўнага часу студэнты яшчэ не адчуюць. І ўсё ж пачынаць трэба.

На жаль, у гэтым годзе студэнты амаль не ўдзельнічалі ў планаванні сваёй самастойнай работы. А такі ўдзел мог бы стаць адным з рэальных напрамкаў у камсамольскім студэнцкім самакіраванні. Вельмі важна, каб тая самастойная праца, якая плануецца замест часткі аўдыторных заняткаў, не прывяла да перагрузак студэнтаў. Вось чаму студэнты павінны не толькі ведаць, што плануюць кафедры і метадычныя камісіі, але і абавязкова ўдзельнічаць у такім планаванні і кантролі за выкананнем планаў.

Зразумела, гаворка аб перабудове вышэйшай школы яшчэ толькі пачынаецца. І меркаванняў тут можа быць шмат. Я ж стаўлю кропку і спадзяюся пачуць сустрэчныя галасы.

Н. МЯЧКОЎСКАЯ,
дацэнт кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства.

